Свіслацкая
цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Поразаўская бібліятэка - цэнтр краязнаўства

Помнікі гісторыі і культуры



# Царква Святой Жыватачальнай Троіцы

Поразава, 2014

Калі ў Поразава была пабудавана першая царква і хто ў ёй служыў, пакуль выявіць не ўдалося. Аднак можна меркаваць, што яна дзейнічала, была асвечана ў гонар Нараджэння Прасвятой Багародзіцы, драўляная, невялікая па памерах. Аб гэтым сведчаць дакументы: 7 снежня 1858 года ў Палаце Дзяржаўнай маёмасці абмяркоўвалася пытанне аб месцы будаўніцтва новай царквы ў Поразава.

1867 год. На будаўнічую пляцоўку завезены матэрыялы. Але ўсе планы былі парушаны пажарам, які ўзнік 19 мая 1968 года. Хутка ён ахапіў амаль увесь пасёлак. Як сведчыць матэрыял расследавання, пажар пачаўся з дома яўрэя Міхеля Кабузяцкага, жонка якога вынесла ў сені гаршчок з гарачым вуголлем. Ад яго загарэлася спачатку сцяна ў сенях, а пасля – саламяны дах. Пры моцным ветры полымя разнеслася на суседнія хаты.

Першай справай для праваслаўных веруючых была пабудова часовай царквы. Ужо 16 ліпеня 1868 года быў зацверджаны яе праект. Хутка яго ажыцявілі. Так у Поразава пачала дзейнічаць часовая драўляная Свята-Мікалаеўская царква.

Аб гэтай падзеі ў «Литовских епархиальных ведомостях» ёсць такі запіс: «28 февраля 1869г. Подороский благочинный священник Восинский донес о том, что 6 декабря 1868г. освятил Порозовскую временную деревянную церковь, устроенную по желанию прихожан».

3 лютага 1869 года Ваўкавыскі паветны спраўнік атрымлівае распараджэнне «…независимо устроенной уже в м.Порозово временной деревянной церкви приступить с наступлением весны текущего года к сооружению там постоянного приходского каменного храма». Чатыры гады спатрэбілася праваслаўным веруючым Поразаўскага прыходу для будаўніцтва Свята-Троіцкай царквы. Яна ўзводзілася не толькі за казённыя грошы, але і на ахвяраванні прыхаджан і іншых веруючых. У 1872г. будаўніцтва Свята-Троіцкай царквы было завершана, а 29 красавіка 1873г. «Подороским благочинным священником

Игнатием Кончевским при многочисленном стечении народа освящена в м.Порозово новоустроенная каменная церковь».

Такім чынам, Свята-Троіцкая царква ў Поразаве, якая існуе і сёння, – «...помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю. Чатырохчастковая аб’ёмна-прасторавая кампазіцыя складаецца з 8-граннай званіцы над кубападобным прытворам, кароткай трапезнай, папярочнай прамавугольнай у плане малітоўнай залы, пяцігранай апсіды з бакавымі рызніцамі. Двухсцільны дах асноўнага аб’ёму завершаны па цэнтры цыбулепадобным купалам на 8-гранным барабане, на ўскрайках – макаўкамі. Макаўкамі завершаны вольмавы дах апсіды і шацёр званіцы. Тры ўваходы ў прытворы выраашаны калоннымі арачнымі парталамі, арачныя аконныя праёмы дэкарыраваны рустам».

Але і гэту царкву не абмінуў пажар, які ўзнік ў 1898г. Згарэла страха, быў пашкоджаны алтар храма.

У самым пачатку 20 стагоддзя, а дакладней, у 1905 годзе да Поразаўскага прыходу адносіліся м.Поразава і 25 вёсак. Ёсць звесткі, што ўсяго налічвалася 3059 прыхаджан. За Свята-Троіцкай царквой было замацавана 48 дзесяцін зямлі. На тэрыторыі прыходу знаходзіліся чатыры царкоўна-прыходскія школы.

За ўсе гады існавання храма ў ім служылі 19 святароў.



Пачынаючы з 1991 года і па сённяшні час Свята-Троіцкую царкву ўзначальвае пратаіерэй Фёдар Шэлест.

У 2004 годзе была ўдакладнена назва Свята-Троіцкай царквы.. Яна стала называцца царква Святой Жыванчальной Троіцы.